**Служба** завершана, служба працягваецца // Дняпроўская праўда. — 1999. — 4 снеж. — С. 2.

## СЛУЖБА ЗАВЕРШАНА, СЛУЖБА ПРАЦЯГВАЕЦЦА



Не так даўно ў раённым выканаўчым камітэце сабралі былых воінаў, якія выконвалі свой інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане. А сабралі, каб ва ўрачыстай абстаноўцы ўручыць медалі ў памяць 10-годдзя вываду савецкіх войск з Афганістана.

Атрымаў такі медаль і Мікалай Курпатаў (на здымку), ён таксама быў на той вайне. Службу нёс так, як патрабавалі камандзіры, прысяга і воінскі абавязак.

Але шчасліва вярнуўшыся дамоў, Мікалай выбраў для сябе новую службу – цяпер ён вадзіцель аўтамабіля асобнага пажарнага паста ў в. Зарубы, які ўваходзіць у састаў ВПЧ-30 г. Дуброўна.

Камандаванне часці задаволена службай Мікалая Курпатава: дысцыплінаваны, падцягнуты, заўсёды гатовы да выканання баявога задання.

Добра ўсе склалася і ў асабістым жыцці Мікалая. Ёсць сям'я, як удзельнік вайны на льготных умовах атрымаў кватэру ў новым доме, што неподалёку, дарэчы, ад ВПЧ-30.

А ў гэтыя дні Мікалай Уладзіміравіч па пуцёўцы, выдадзенай раённай асацыяцыяй воінаў-інтэрнацыяналістаў, адпачывае ў Рэспубліканскім цэнтры медыцынскай рэабілітацыі воінаў-інтэрнацыяналістаў, што гады 2–3 назад адкрыўся ў Віцебску. Гэта сведчанне таго, што ў нашай краіне клапоцяцца аб такіх людзях. А ад іх патрабуецца сумленна служыць абранай справе.

**Фота Л. Шаўчэнка**